Садоха Н.

# ЗАСТАЎСЯ Ў ВЫШЫНІ

...Красніца была спалена 17 ліпеня 1942 года. У той дзень загінула больш за восем соцень мірных жыхароў. Але выпускнік Чкалаўскага лётнага вучылішча Георгій Надтачэеў гэтага не ведаў. Лісты ад маці ўжо не прыходзілі. Ды і мінула больш за год, як ён пакінуў бацькоўскую хату. Але кожную ноч сніў шырокі прастор падняпроўскіх палёў і матчыны рукі з гарлачыкам цёплага малака. Георгій даўно страціў надзею яшчэ калі-небудзь убачыць усё гэта зноў. У гэты ж дзень малады лётчык атрымаў першае службовае заданне. Галоўны подзвіг чакаў яго наперадзе...

Георгій Надтачэеў нарадзіўся ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння васьмігодкі вучыўся ў школе фабрычна-завадскога навучэнства, працаваў электраманцёрам паравознага дэпо на чыгунцы ў Магілёве. Але неба вабіла яго. І ў 1940 годзе Георгій скончыў навучанне ў Магілёўскім аэраклубе, працаваў у ім інструктарам.

Яму было 25, калі ў чэрвені 1941 года ён быў прызваны ў Чырвоную армію. Напачатку ліпеня прымаў удзел у баях за Магілёў, а потым Георгія накіравалі на вучобу ў Чкалаўск. Сыходзячы з хаты простым жаўнерам, яму не было наканавана вярнуцца. Вернецца яго імя. І будзе жыць вечна ў сэрцах усёй Беларусі. Гэта будзе значна пазней.

Лётную справу пачынаў у бамбардзіровачным авіяцыйным палку. У яго складзе Георгій выканаў 82 начных баявых вылета. Аднак гэтага яму было недастаткова, і ў 1943 годзе Надтачэеў перавучваецца на лётчыка-штурмавіка. Напрыканцы 1943 года пачынае службу ў 76 гвардзейскім авіяцыйным палку.

31 снежня 1944 года ён здзяйсняе свой подзвіг. У гэты дзень полк ударыў па нямецкім аэрадроме ў раёне пасёлка імя Варашылава. Георгій збіў адзін самалёт ворага, а таксама зрабіў тры тараны. Але фашысты здолелі падбіць штурмавік камандзіра – лейтэнанта Прадчэева. Ні імгнення не думаючы, Георгій накіраваўся на дапамогу камандзіру. Адкрыў агонь па салдатах ворага, што беглі да падбітага самалёта, затым пасадзіў свой штурмавік побач з самалётам Прадчэева, прыняў на борт лётчыка і стралка-радзіста. Ён бачыў немцаў, яны беглі, стралялі, імкнуліся загнаць яго ў вугал, акружыць. Але аднолькава з тым ён бачыў рукі маці, што трымалі гарлачык з малаком, бачыў хату, родную Красніцу. Ён не мог памерці. Не зараз. Зараз, у гэтую хвіліну, ад яго залежылі не толькі лёсы людзей, але і вынік усёй аперацыі. Ён гэта ведаў. І яго штурмавік узняўся. А праз некаторы час прызямліўся на аэрадроме.

Ішоў час. Вясной 1944 года немцы адступалі. Георгій лятаў, здзейсняў тараны, чакаў перамогу. 13 красавіка, пакуль яго полк знаходзіўся ў Севастопалі, у Крамлі было прынята рашэнне за бліскучае выкананне баявых заданняў камандавання, мужнасць і адвагу праяўленыя ў

барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР узнагародзіць Надтачэева Георгія Мяфодзьевіча ордэнам Леніна і прысвоіць яму званне Героя Савецкага Саюза.

Аднак узнагароду ён не атрымаў. 25 красавіка, падчас Крымскай наступальнай аперацыі штурмавік Г. М. Надтачэева быў падбіты нямецкімі ворагамі. Пры падзенні самалёт узарваўся, экіпаж загінуў.

Севастопаль быў вызвалены 9 мая 1944 года, а праз год СССР святкаваў Вялікую Перамогу. У 1965 годзе Севастопаль атрымаў званне Горада-Героя.

Месцам смерці Георгія прынята лічыць Сапун-гару. Аднак сярод імёнаў воінаў на мемарыяльным помніку не так проста знайсці імя Героя СССР.

Георгій Мяфодзьевіч Надтачэеў не ведаў, што ён Герой Савецкага Саюза, не ведаў, што яго вёска спалена, не ведаў пра смерці родных і блізкіх. Ён не нарадзіўся Героем. Ён нарадзіўся вясковым хлопцам. Замест родных лясоў і падняпроўскіх палёў Быхаўшчыны, яго магілай сталі мора, горы, далёкі Крым. Ён марыў, кахаў, смяяўся. Яму было ўсяго 27.

**Садоха, Н. Застаўся ў вышыні / Н. Садоха // Маяк Прыдняпроўя (Быхаў). — 2016. — 23 лістапада. — С. 3.**